**Білет 25**

**Практычнае заданне.**

**Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, асноўныя заняткі, племянныя княствы, кіраванне імі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце саюзы ўсходнеславянскіх плямёнаў, якія склаліся ў VIII–IX стст. на тэрыторыі Беларусі.
2. Ахарактарызуйце геаграфічнае становішча саюзаў славянскіх плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў VIII–IX стст.
3. Складзіце схему «Гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян у VIII–IX стст. ». Якія змены адбываліся ў гаспадарцы славян у гэты перыяд?
4. Ахарактарызуйце сістэму кіравання племянным княжаннем ва ўсходніх славян.

**I. Картасхема. Усходнеславянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі ў VIII–IX стст.**



**II. Заняткі ўсходніх славян** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. 6 клас»)*

У гаспадарцы ўсходніх славян панавала земляробства. Менавіта яно давала славянам асноўныя прадукты. Таму славяне збожжавыя культуры звалі "жытам" - ад слова "жыць". Асноўнай формай земляробства было падсечнае. Але ўжо ў Раннім сярэднявеччы распаўсюдзілася ворыўнае земляробства. Для рыхлення глебы выкарыстоўвалася рала, якое цягнулі валы. Гэта дазволіла павялічыць ураджаі. У далейшым сталі прымяняць саху.

Важнае значэнне мела жывёлагадоўля. Славяне разводзілі кароў, коз, авечак, свіней, а таксама коней.

Вялікую ролю ў жыцці славян, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі, адыгрывалі разнастайныя рамёствы. Выраблялiся прылады працы і зброя, посуд і ўпрыгожанні. Славянскія жанчыны ўмелі прасці і ткаць. Пра гэта сведчаць паўсюдныя знаходкі гліняных прасліц. Найпростымі рамёствамі - цяслярскім, кастарэзным, апрацоўкай шкур і іншымі - займаліся ў кожнай сям'і. Значна большых намаганняў і ўменняў патрабавалі выплаўленне жалеза і вытворчасць з яго розных прадметаў. Кавалі рабілі сашнікі, сякеры, сярпы, косы, нажы. З каляровых металаў - золата, срэбра, медзі - выраблялiся ўпрыгожванні. З IX ст. усходнія славяне пры вытворчасці глінянага посуду сталі выкарыстоўваць ганчарны круг. Але яшчэ доўга просты посуд з гліны ляпілі рукамі, а затым абпальвалі ў печы.

Славяне заўсёды сяліліся ля вадаёмаў – рэк і азёр. Таму важнай складовай часткай іх гаспадаркі было рыбалоўства. У тыя далёкія часы лясы пакрывалі ўсю тэрыторыю Беларусі. У іх людзі збіралі ягады і грыбы. Славяне палявалі на зуброў, ласёў, аленяў, дзікоў, птушак, пушных звяроў. Распаўсюджана было бортніцтва - збор мёда дзікіх пчол.

Паступова ўсходнія славяне ўключаліся ў гандаль з суседзямі і больш аддаленымі краінамі. На продаж яны маглі прапанаваць мех, мёд і воск.

**III. Схема. Арганізацыя ўсходнеславянскага грамадства.**

